Источник: “Мінская праўда” – 2014-12-09

# Зорка Максіма Танка



У Мядзелі адкрылі помнік народнаму паэту Беларусі Максіму Танку. Урачыстая цырымонія прайшла на плошчы Шаранговіча ў прысутнасці землякоў паэта, прадстаўнікоў прадпрыемстваў і арганізацый райцэнтра, грамадскіх структур, дзеячаў культуры, моладзі.

А напярэдадні ўдзельнікі мерапрыемства наведалі магілу паэта ў вёсцы Новікі, азнаёміліся з музеем у Сваткаўскай сярэдняй школе. У Мядзелі была наладжана літаратурнамузычная гасцёўня, экспанавалася выстава з фондаў сталічнага музея гісторыі беларускай літаратуры. Завяршыла святочныя мерапрыемствы выступленне Нацыянальнага акадэмічнага народнага аркестра Беларусі імя Жыновіча.

На адкрыцці помніка выступоўцы гаварылі аб значэнні творчасці Максіма Танка — паэта еўрапейскага маштабу. Падкрэслівалі, што багатую духоўную спадчыну ён пакінуў нам у сваіх зборніках «Каб ведалі», «На камні, жалезе і золаце», «След бліскавіцы», «Мой хлеб надзённы», «Дарога, закалыханая жытам», «Прайсці праз вернасць», «Нарачанскія сосны». Не выпадкова творчая, працоўная і грамадская дзейнасць Максіма Танка адзначана званнямі народнага паэта Беларусі, акадэміка Акадэміі навук БССР, Героя Сацыялістычнай Працы, многімі літаратурнымі прэміямі.

...Выкананы з бронзы помнік — даніна памяці і знак павагі да знакамітага земляка — устаноўлены каля гарадскога Дома культуры: фігура паэта на пастаменце з граніту. Максім Танк крочыць па дарозе жыцця, уважліва ўглядаючыся ў далячынь. Побач валун з выявай разгорнутай кнігі, там радкі з верша паэта: «Ёсць адна песня песняў — пра Радзіму».
Помнік Максіму Танку абяцае стаць візітнай карткай Мядзеля. Створаны ён па праекту твор чай групы, у якую ўвай шлі скульптары Іван Міско і Аляксандр Фінскі, а таксама архітэктар Армен Сардараў.

— Імя Максіма Танка — адно з самых яркіх у гісторыі беларускай літаратуры, — распавядае Армен Сардараў. — Як вядома, ён нарадзіўся і вырас на Мядзельшчыне і вельмі любіў сваю малую радзіму, часта бываў тут. Для мяне вялікі гонар удзельнічаць у стварэнні помніка гэтаму выдатнаму чалавеку. З самага пачатку мы імкнуліся пазбегнуць афіцыйнасці, залішняй пафаснасці. Стваралі вобраз, блізкі і людзям, і архітэктуры Мядзеля, яго прыродзе. Як гэта нам удалося — меркаваць іншым. Але хачу падкрэсліць, што з’яўленне такога помніка — заслуга жыхароў Мядзельшчыны, якія імкнуліся дастойна ўшанаваць памяць паэта-земляка, свайго Максіма.